Далучайся!

Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

ГАСЦІНЕЦ

№ 14 (330) ВЕРАСЕНЬ 2022 ГОДА

БЕЛАРУСКІЯ ПАВУЧАННІ

**Не вер нікому – ніхто не абманіць.
Не вер чужому слоўку, а вер свайму вочку.**

СПОРТ

СІЛ НЕ ХАПІЛА НА КАНЦОЎКУ ГУЛЬНІ...

У суботу ў Гарадку адбыўся захапляльны матч ФК «Гарадоцкія Львы» з лідэрам Віцебскага дывізіёна другой лігі чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па футболу ФК «Вялес — 2020» з Віцебску, які лічыўся гаспадаром поля. Нешматлікія гледачы пабачылі роўную, напружаную гульню да 80-й хвіліны. Істотна на ход гульні паўплывала выдаленне нашага абаронцы і трэнера ў другім тайме. Як гэта было?



Першынство Віцебскага дывізіёна другой лігі чэмпіянату Рэспублікі Беларусь выйшла на фінішную прамую, калі камандам засталося згуляць па два матча. Лідзіруючая чацвёрка мела такі відарыс:

ФК «Вялес — 2020» перад матчам 17 тура — 42 ачкі, ФК «Газавік» — 41, ФК «Мёры» — 35, ФК «Гарадоцкія Львы» — 33 і ў суботу сустракаліся паміж сабой. На пачатку нашай гульні было вядома, што «Газавік» упэўнена перамагае мёрскую каманду з лікам 3:0 (канчатковы — 3:1). І пры перамозе нашай каманды нам маглі бы дастацца бронзавыя медалі гэтага сезону.

Але шанцаў на гэта было мала. Гульню прапускаў наш вядучы бамбардзір Назар Іваноў, які выступаў за сваё прадпрыемства на турніры ў Мінску. Таксама не маглі за родны Гарадок гуляць нашы таленавітыя маладзёны Міхасёнак і Быўнькоў...

Тым не менш супраць лідэра сезону, які мае моцнае фінансаванне, сучасную падрыхтоўку і доўгую лаву запасных, гарадоцкая каманда гуляла вельмі здорава. Асабліва ў першым тайме. Упэўненасць гульцам надаваў капітан Арцём Палавінскі, які надзейна бараніў сваю браму і потым не раз адбіваў, як кажуць небяручыя мячы. Добра ў сярэдзіне поля гуляў Мікалай Пятроў, які мог вольна абыграць двух-трох віцебчукоў і аддаць добры пас. Ды і іншыя гульцы змагаліся, як львы. У выніку Іван Гарбузаў ужо на 18-й хвіліне пры першай магчымасці прымусіў віцебскага галкіпера дастаць мяч са сваёй брамы. Уся каманда віншавала Івана з такім патрэбным голам...

Гульцы «Вялеса» нічога істотнага амаль за ўвесь тайм не здолелі стварыць, толькі раз нанёсшы прыцэльны ўдар па нашай браме. Але напрыканцы матчы гаспадары поля віцебчукі атрымалі права на штрафны ўдар каля вуглавога сцяжка. Уся віцебская каманда пайшла да штрафной. І пры розыгрышы штрафнога мяч рэкашэтам ад нашага гульца, змяніўшы накірунак, трапіў у сетку на перадапошняй хвіліне першага тайма.

Але гэта не зламіла нашу каманду, не зменшыла яе імпэт. На пачатку другога тайма мы на роўных працягвалі гуляць да 60-й хвіліны гульні. Менавіта ў гэты час у вельмі спрэчным сутыкненні, дзе было дастаткова, мяркую, штрафнога, малады суддзя Фарыд Новікаў з Наваполацку паказаў другую жоўтую картку Мікіце Пуйшы і выдаліў яго з поля. Калі на гэта эмацыйна прарэагаваў гарадоцкі трэнер Сяргей Куракоў, то і ён атрымаў чырвоную картку.

Застаўшыся з дзесяццю гульцамі наша каманда працягвала мужна змагацца. Віцебчукі, маючы доўгую лаву, правялі пяць замен і працягвалі нарошчваць ціск на нашу абарону. У нас атрымаў пашкоджанне Назарчук Максім і яго замяніў юны Плюшчэўскі Дзмітрый. Нарэшце «вялесаўцы» на 80-й хвіліне выйшлі наперад. На 85 хвіліне, калі лік быў 3:1 ветэрана каманды Мікалая Пятрова замяніў юны форвард Рыгор Давыдаў. У дадатковы час Сяргей Церах на 92-й хвіліне давёў лік да 5:1.

Гэта буйная параза, але толькі ў гэтым канкрэтным матчы. Гэта параза ад моцнай каманды, якая мае значныя рэсурсы і мае мэтай першыю лігу чэмпіяната Беларусі. Гэта параз ад каманды, кіраўніцтва якой ставіла задачу перамагчы з лікам 7:1 і не дасягнула яе. Гэта параза пры сумнеўным выдаленні і чарговым эмацыйным зрыве нашага трэнера.

Хто не працуе, той не памыляецца.

Істотна, каб памылкі не паўтараліся. Істотна, каб было большае яднанне каманды і яе заўзятараў. Істотна, каб наша каманда не растрачвала ачкі са слабымі сапернікамі. Істотна, каб была каманда прыхільнікаў, якая кіруе гарадоцкім футболам...

Лявон Гаравы

Таксама чытайце з пратаколу матча:

СУДДЗІ: Новікаў Фарыд (Наваполацк), Бучкін Вячаслаў (Полацк), Харытонаў Ігар (Наваполацк).

Рэзервовы суддзя: Перадзярэеў Васіль (Наваполацк).

ВЕЛЕС-2020: Маталыга Ілля (Галамака Алег, 46), Дарашэнка Валерый, Кручанюк Дзмітрый (Церах Сяргей, 73), Дубіновіч Вадзім, Смунёў Сямён, Шакураў Кірыл, Ждан Аляксей (Канаплёў Арцём, 65), Шугункоў Мікіта (к), Параханько Аляксей (Клямята Дзмітрый, 65), Сіяка Антонія (Сядзельнікаў Артур, 57).

Запасныя: Буксанаў Зміцер, Вараб'ёў Ілля, Тарасевіч Аляксандр, Мялік Ілля.

ГАРАДОЦКІЯ ЛЬВЫ: Палавінскі Арцём (к), Пуйша Мікіта, Пятроў Мікалай (Давыдаў Рыгор, 85), Мамліенка Аляксандр, Чарнухін Яўген, Маславец Клеменцій, Багданаў Дзяніс, Паграбняк Віталь, Гарбузаў Іван, Назарчук Максім (Плюшчэўскі Дзмітрый, 80).

ГАЛЫ: 0:1 — Гарбузаў Іван (18). 1:1 — Маславец Клеменцій (44, у сваё вароты). 2:1 — Шакураў Кірыл (80). 3:1 — Дзмітрый Плюшчэўскі (82, у сваё вароты). 4:1 — Шугункоў Мікіта (88). 5:1 — Церах Сяргей (90+2).

ПАПЯРЭДЖАННІ: Шакураў Кірыл (37), Церах Сяргей (88) — Пуйша Мікіта (38), Паловінскі Арцём (80), Чарнухін Яўген (82).

Выдаленне: Пуйша Мікіта (64, за грубую гульню пасля раней атрыманага папярэджання).

Выдаленне АФІЦЫЙНЫХ АСОБ: Куракоў Сяргей (65, Абраза і абразлівыя выказванні ў адрас суддзі).

Паводле: vk.com/public118650590

ДОСКА ПОЧЕТА

«Я УВЕРЕНА — КАЖДЫЙ РЕБЁНОК ТАЛАНТЛИВ!»

Людмила Кутузова почти 26 лет работает учителем истории и обществоведения в ГУО «Средняя школа № 2 г. Городка им. А.П. Соболевского». За добросовестный труд и безупречную работу в системе образования района в 2021 г. была занесена на районную Доску почёта.

Ещё в школьные годы Людмила мечтала стать учителем. Тогда ей нравились все школьные предметы, а особенно: русская и белорусская литература, история и математика. Помогала и направляла её учитель истории Лилия Феликсовна Сидоренко, благодаря которой, будущая учительница нашла своё призвание. В 1991 г. поступила в «Витебский государственный институт им. С.М. Кирова». А в 1996 г. вернулась в родной город и начала свою педагогическую деятельность.

— Профессия учителя всегда привлекала меня своей гуманностью и благородством. Быть педагогом — значит быть человеком творческим, с богатым внутренним миром и неиссякаемой жизненной энергией, — рассказывает Людмила Ивановна. — Я люблю свою работу и благодарна судьбе за то, что она дала мне возможность быть полезной людям.

— Какие мысли Вас посетили, когда Вы впервые проводили урок?

— Я была уверена в своих знаниях и не боялась преподносить материал. Однако, присутствовал небольшой страх перед детьми, как они меня воспримут, какие вопросы могут задать.

— Кто для Вас современный учитель?

— Это мастер своего дела, профессионал. Стремление к постоянному саморазвитию и самосовершенствованию наполняет мою жизнь смыслом. При этом профессиональный рост педагога невозможен без самокритики и способности учиться на неудачах. Да, быть современным учителем нелегко, зато интересно. Если вы любите свою профессию, всегда стремитесь в ней к новым горизонтам и получаете от своей деятельности удовольствие — вы ещё и счастливый педагог. Только учитель, успешный в своей профессии, может научить и воспитать счастливого ученика.

— В чём особенность педагогической деятельности с современными детьми?

— Для того, чтобы быть успешным в современном мире, детям необходимо быть постоянно готовым к изменениям, сохраняя при этом свою неповторимость. Раскрытие индивидуальности в творческой среде — в этом я вижу цель своей педагогической деятельности. Настоящий учитель — тот, кто способен спуститься с высот своих знаний до незнания ученика и вместе с ним совершить восхождение.

— Что Вы можете пожелать молодым педагогам?

— В первую очередь, здоровья и терпения, больше детей у которых вы сможете раскрыть их возможности и таланты. Не бойтесь экспериментов, идите в ногу с современными педагогическими веяниями. Возьмите лучшее у тех, кто обучал вас, чтобы полностью реализовать потенциал молодого поколения.

Виктор СТРЕЛЬЦОВ
www.garadvest.by

РЭХА ПАДЗЕІ

КУЛИНАРНЫЙ ФЕСТИВАЛЬ ПРОШЁЛ ЗРЕЛИЩНО И ВКУСНО!

Праздник «МАРА ГУРМАНА-2022» в урочище Воробьёвы горы прошёл на ура. В день его проведения и некоторое время после практически все социальные сети пестрили фотографиями с кулинарного фестиваля. Сейчас мы предлагаем подробнее остановиться на том, как же это было…



В прошлом номере мы кратко описали общую атмосферу сего масштабного действа, а сейчас предлагаем внести чуть больше конкретики. Итак, начнём с главного — кулинарного поединка по приготовлению блюд из мяса лося. Узнать, где создавались эти шедевры кулинарии было довольно просто — аромат в воздухе витал непередаваемый! За дымовой завесой от горящих костров неустанно суетились повара, шеф-повара, не побоимся этого уточнения. Ведь они так уверенно выполняли все необходимые манипуляции с продуктами! А во время презентации блюд, яства так аппетитно выглядели, что сразу стало ясно — определить победителя будет непросто. Но компетентное жюри, которое возглавили председатель Городокского райисполкома Пётр Коробач, а также основатель улиточной фермы полного цикла с центром гостеприимства «ЭСКАРГО Д'ОР» («Золотая Улитка»), шеф-эскаргортье Алексей Корочкин со своей задачей справились.

Самое вкусное блюдо из мяса лося приготовили гости праздника — команда УО «Витебский государственный индустриальный колледж». А за победу они получили внушительный приз — казан на 10 л с печью и дымоходом. Вторую позицию уверенно заняли представители УО «ГГАТК», а «бронзовыми» победителями стали работники РКП «ЦУАСП». Обеим командам вручили по казану с шумовкой. Так сказать, для дальнейшего развития в гастрономической сфере.

Очень зрелищным выдался и конкурс «Оригинальный драник». Стоило увидеть, как работники РКП «ЦУАСП» переворачивали свой огромный драник на горячей сковороде. Даже овации сорвали после успешной манипуляции! Драник-бургер, драник с перепёлкой — и ещё много вкусных секретов предстояло распробовать жюри. Но всё же тройка победителей определилась. Победу одержала команда ОАО «Птицефабрика Городок», которой досталась кастрюля-пароварка. Следом за ней расположились представители УО «ГГАТК», они выиграли кухонные весы. А на третьей ступени — Полоцкий ГХТК, у них о «Маре гурмана» останутся не только приятные воспоминания, но и приз — соковыжималка.

… Особым теплом и домашним уютом был овеян конкурс пирогов «Вкус семейных традиций». У каждой хозяйки есть свои секреты приготовления этой сдобы, которая собирает за большим столом на чаепитие большую и дружную семью. И каждая из них достойна победы. Зрители сделали выбор в пользу выпечки хозяек Людмилы Валентиновны Святой и Галины Ивановны Новиковой. Они же победили в номинации «Самый аппетитный пирог».

Раз уж речь зашла о чаепитии, то его бессменный атрибут — варенье. Оно и было презентовано на выставке-конкурсе «Забавы сладкоежек». Библиотечная выставка «Осенний погребок», а также дегустация варенья собрала много любителей сладкого. По результатам голосования приз зрительских симпатий получило варенье «Шоколадная слива», приготовленное хозяйкой из г. Невель. Также коллектив библиотеки показал мастер-класс по приготовлению варенья из различных фруктов и ягод на костре.

…Ещё одним развлечением для всех гостей фестиваля стала зоо-выставка «Городокское подворье-2022», организованная профсоюзами Городокщины и ГЛПУ «Городокская райветстанция». Сфинкс и пушистый статный кот весом более 9 кг, кролики, морские свинки, черепахи, куры необычного окраса, — все они приковывали внимание детей и взрослых. Особый ажиотаж вызвало голосование за полюбившегося питомца. Все победители получили дипломы и призы от райобъединения профсоюзов и райорганизации профсоюза работников АПК.

«Мара гурмана» — праздник, который пропагандирует здоровый образ жизни. А он включает не только правильное питание, но и занятия спортом. Так что после плотной дегустации вкусностей у всех желающих была отличная возможность размяться и принять участие в «Спортивном лабиринте», дартсе и эстафете «Картофельные забеги». Фишкой фестиваля стали и петушиные забеги. Азартное развлечение, стоит отметить, гостям оно особенно полюбилось.

Подведём краткий итог. Во-первых, было очень вкусно, ведь после приготовления все блюда можно было бесплатно продегустировать. Для особенных гурманов в продаже также было представлено мясо улиток. Во-вторых, было интересно: артисты подготовили насыщенную развлекательную программу, представители предприятий, организаций и учреждений региона также внесли свою лепту. В-третьих, будем ждать следующей «Мары гурмана»!

(скарочана)

Юлия РУДЯКОВА
www.garadvest.by

ФІНАНСЫ

ЗА ПАЎГОДДЗЕ ІСТОТНА ПАГОРШЫЛІ ПРЫБЫТКІ

Паводле інфармацыі Віцебскага абласнога ўпраўлення статыстыкі Гарадоцкі раён больш чым напалову скараціў чыстыя прыбыткі, як і большасць раёнаў Віцебшчыны. Што з прыбыткамі ў раёнах і хто стаў найбольш стратным з іх у Віцебскай вобласці?

Апублікаваная інфармацыя Віцебскага абласнога ўпраўлення статыстыкі пра «Фінансы арганізацый» дае дакладны малюнак рэальнай дзейнасці ў раёнах паўночнай Беларусі за першае паўгоддзе 2022 году.

Арганізацыі нашага раёна атрымалі чыстага прыбытку менш мільёна рублёў — 900 тысяч руб. У абсалютных лічбах менш толькі ў Шаркаўшчынскага раёну — 700 тысяч руб. Гэта калі не лічыць раёны спрацаваўшыя ў мінус — Дубровенскі 4100 тыс. руб і Мёрскі — 39 000 тыс. руб.

Больш істотна дынаміка прыбытку ў параўнанні з 2021 годам: наколькі раён павялічыў або паменшыў прыбытковасць арганізацый. Сярод павялічыўшых прыбыткі ў працэнтах лідэрам нечакана стаў Расонскі раён — 185,1% пры атрыманні прыбытку ў 2,0 млн. руб. Аршанскі раён, які мае павышаную да сябе ўвагу кіраўніцтва, мае 154,2 % прыросту пры 84,1 млн. руб прыбытку. 3 150,3% росту прыбыткаў з намінальнай велічынёй у 15,9 млн. руб Пастаўскі раён, які дэманструе зайзлросную арганізаванасць, як сельскай гаспадаркі, так і прамысловасці.

Калі казаць пра раёны, якія страцілі пазіцыі ў параўнанні з 2021 годам, то тут аўтсайдэрам стаў Бешанковіцкі раён, які з прыбыткам у 2,6 млн. руб мае толькі 12,1% да мінулагодняга ўзроўня ў 21,5 млн. руб. Значна страціў прыбыткі Докшыцкі раён ад 6,3 млн. да 1,6 млн. руб, што склала толькі 25,6% да 2021 году.

Таму гарадоцкія 0,9 млн. руб прыбытку ад мінулагодніх 2,0 млн. руб складаюць усяго 47,2%. Гэта менш паловы ранейшага ўзроўню.

Але таксама меш паловы мінулагодняга прыбытку маецца ў арганізацый Лёзненскага, Полацкага, Талачынскага і Шаркаўшчынскага раёнаў.

Наступная табліца стратных арганізацый у гарадах і раёнах дае ўяўленне пра дынаміку стратаў ад мінусуючых структур. У Гарадоцкім раёне дадалася за 2022 год яшчэ адна арганізацыя ў спіс стартных. Але больш істотна, што стратнасць гэтых арганізацый вырасла з 0,2 млн. руб да 2,5 млн. руб — аж у 12,7 РАЗЫ!

Блізкі да такога бурнага росту Дубровенскі раён, які наогул у мінусе. Тут цікавае становішча, што раней у раёне было тры стратныя арганізацыі, якія мелі мінус 0,9 млн. руб. А зараз засталася адна з мінусам за паўгода ў 11,4 млн. руб. Раён адпаведна мае рост стратаў у 12,3 разы! Яшчэ рост стратаў у разы маюць Докшыцкі —6,5разы , Лепельскі і Талачынскі ў 3,4 разы.

З'явіліся раёны, дзе няма стратных арганізацый. Ад двух пазбавіўся Бешанковіцкі раён і ад адной — Вушацкі раён. Малайцы! Толькі ў Бешанковіцкім раёне, як пісалі раней, істотна зменшылася прыбытковасць.

Яка будзе дынаміка прыбыткаў у раёнах Віцебшчыны пакажа другая палова гэтага году. Гэты аналіз зроблены на падставе статыстычных даных з адкрытага доступу тут: https://www.belstat.gov.by

Лявон Гаравы

ПЕРАСЛЕД

СУД НЕ ПРИЗНАЛ ПИКЕТИРОВАНИЯ

В Витебске суд не признал пикетированием бело-красно-белые магнитики на холодильнике.

Напомним, что Сергей Сесицкий в августе был задержан по подозрению в оскорблении президента, в рамках уголовного дела дома у него произошел обыск, во время которого изъяли три бело-красно-белых магнитика с дверцы холодильника и чехол для телефона с гербом «Погоня», который хранился в тумбочке.

Из Следственного комитета информацию переслали в Октябрьский РОВД, для проверки по факту возможного административного правонарушения. 7 сентября Сесицкого вызвали в райотдел, составили протокол о совершении административного правонарушения, предусмотренного частью 1 статьи 24.23 КоАП и продержали трое суток в ИВС.

Дело рассматривал судья Цариков, недавно посадивший журналистку Татьяну Матвееву на 8 суток за бело-красно-белые полоски на аватарке в facebook. На суде Сергей Сесицкий признал, что магнитики и чехол с символикой находились в его квартире, однако не признал, что этим он проводил пикет. Цариков, в свою очередь, отметил, что материалы дела об административном правонарушении не содержат сведений ни о том, в каком месте проводилось несанкционированное мероприятие, ни о том, как Сесицкий публично демонстрировал неустановленному кругу лиц магнитики на двери своего холодильника.

Поскольку же статья 24.23 предусматривает публичное выражение своей позиции, то судья посчитал недоказанным совершение Сергеем Сесицким административного правонарушения, в связи с чем производство дела было прекращено за недоказанностью вины.

Сяржук Серабро
vitebsk.cc

ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ

«ПРАПАГАНДА „РУССКОГО МИРА“». ШТО НЕ ТАК З ГІСТАРЫЧНЫМІ РОЛІКАМІ

Нядаўна мінскія ўлады адказалі на петыцыю, у якой беларусы прасілі патлумачыць, чаму ў транспарце круцяць ролікі са скажонымі гістарычнымі фактамі. Чыноўнікі паабяцалі прыслухацца. Аднак відэа дагэтуль паказваюць у сталічных аўтобусах і метро. CityDog.io даведаўся ад гісторыка пра памылкі, якія прысутнічаюць у некаторых з іх.



Што гэта за ролікі?

Серыя відэа, якія зараз круцяць у мінскім транспарце, называецца «Беларусь. История». Стварылі яе па замове Мінгарвыканкама «ў мэтах выканання рэспубліканскага плана мерапрыемстваў па правядзенні ў 2022 годзе Года гістарычнай памяці (...) з мэтай павышэння эфектыўнасці грамадзянска-патрыятычнага выхавання насельніцтва».

Зрабілі і пачалі публікаваць відэа летась, але да нядаўняга часу глядзець іх можна было толькі на YouTube-канале. Сёлета ж у ліпені ролікі пачалі трансляваць у мінскім метро, у аўтобусах і тралейбусах. Пускаць серыю пачалі таксама па рашэнні Мінгарвыканкама.

Чаму беларусы рабілі петыцыю супраць ролікаў?

Аўтары петыцыі прааналізавалі некалькі відэаролікаў і знайшлі ў іх факталагічныя недакладнасці.

Напрыклад, у відэаролiку «Брестская уния» расказваецца, што ў кастрычніку 1596 г. у Берасці адбыўся Сабор, «который объявил о присоединении православных к католической церкви». Хаця насамрэч Берасцейская унія падтрымлівала ідэю аб'яднання абедзвюх цэркваў у межах ВКЛ, а не падпарадкаванне адной царквы іншай, як гэта паказана ў відэа.

Стваральнікі петыцыі прасілі патлумачыць, хто рабіў гэтыя відэаролікі, і прасілі праверыць відэа на наяўнасць памылак. У выпадку іх выяўлення аўтары патрабавалі перастаць паказваць іх у грамадскім транспарце.

Гісторык: «Гэта не асветніцтва, а свядомая прапаганда „русского мира“»

Ролікі з серыі «Беларусь. История» вельмі кароткія, максімум па паўтары хвіліны. Па словах кандыдата гістарычных навук Аляксандра Пашкевіча, зразумела, што ад прадукту ў такім лаканічным фармаце цяжка вымагаць вычарпальнага ахопу тэматыкі.

Пашкевіч лічыць, што ў гэтых роліках складана знайсці яўную хлусню, калі разглядаць іх з пункту гледжання факталагічнай адпаведнасці. Стваральнікі дзейнічаюць больш тонка. Іх метад — не такая грубая фальсіфікацыя. Яны падбіраюць нават праўдзівыя факты, а потым складаюць іх у пэўны ідэйны ланцужок.

Калі разглядаць ролікі агулам, то можна ўбачыць, што аўтары трымаліся пэўнага прынцыпу: прысвячаць іх выключна тым тэмам і асобам, якія звязаныя з гістарычнымі пазітыўнымі сувязямі Беларусі і Расіі. Пра іншых суседзяў, з якімі ў беларусаў былі супольныя Вялікае Княства Літоўскае і Рэч Паспалітая, — альбо ніяк, альбо толькі кепска.

Напрыклад, уся віна за падзел Беларусі пасля Першай сусветнай вайны ўскладаецца выключна на польскі бок, хоць падпісантаў дамовы ў Рызе, паводле якой нашу краіну падзялілі, было двое: Польшча і Савецкая Расія.

Польская палітыка ў 1920-30-х у дачыненні да беларускай меншасці малюецца ў адназначна чорных танах. Параўнання з рэаліямі СССР 1930-х, калі ў БССР ішлі масавыя рэпрэсіі, аўтары роліка проста не робяць.

Пра сталінскія рэпрэсіі ці калектывізацыю ролікаў у гэтай серыі ўвогуле няма інфармацыі, затое пры расповедзе пра «жахі» жыцця пад Польшчай у ілюстрацыйным шэрагу з'яўляецца, напрыклад, палаючая вёска — і гэта яўная маніпуляцыя.

— Мэта стварэння ролікаў выступае настолькі яскрава, што не падлягае сумненню. Гэта не асветніцтва, а свядомая прапаганда «русского мира».

«Афанасий Брестский. Мученик за Веру»: грубыя асацыяцыі з карнікамі ў Другой сусветнай вайне

Ролік расказвае пра жыццё Афанасія Філіповіча. Яго ў відэа называюць Афанасіям Брэсцкім. Гэты чалавек увайшоў у беларускую гісторыю як прынцыповы праціўнік Берасцейскай царкоўнай уніі ды абаронца праваслаўя. Сюжэт круціцца выключна вакол гэтага.

Паралельна аўтары расказваюць, як у 1648 годзе ва Украіне пачалося паўстанне пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага, а «польско-литовские власти начали жесточайший террор против православного населения». І гэты «террор» разам з палаючай вёскай, якую паказваюць на фоне відэа, выклікае яўную асацыяцыю з часамі Другой сусветнай вайны — гэта грубая маніпуляцыя гістарычнымі фактамі.

Багдан Хмяльніцкі насамрэч выступаў супраць улады Рэчы Паспалітай. Аднак акрамя «защиты православной веры», як узгадваецца ў відэаролiку, было яшчэ некалькі прычын паўстання: рост падаткаў і павіннасцей, а таксама прыгнёт сялян. У відэа пра гэта не згадваецца ні слова.

Гучыць у роліку і моцнае «каратели» — зноў негатыўная канатацыя з Другой сусветнай вайной. Для большага эфекту спосабам пакарання смерцю Афанасія адназначна называецца закопванне яго жывым у зямлю, але ў гістарычных крыніцах наконт смерці рэлігійнага дзеяча ёсць розныя меркаванні.

Такім чынам, асноўныя факты былі захаваны, але не ва ўсім аб'ёме.

«17 сентября — День Воссоединения»: не згадваюцца важныя гістарычныя факты

Гэта відэа расказвае пра падзеі 17 верасня 1939 года. У роліку яны паказаны як «освободительный поход» Чырвонай арміі на «оккупированные земли». Дазволіў гэта зрабіць, паводле аўтараў роліка, «военный крах» Польшчы.

Сапраўды, 17 верасня 1939 года адбылася ваенная аперацыя Чырвонай Арміі па ўстанаўленні кантролю над усходнімі тэрыторыямі Польшчы: Заходняй Беларуссю і Заходняй Украінай.

Пры гэтым наяўнасць заключанай 23 жніўня 1939 года тайнай дамовы паміж СССР і нацысцкай Германіяй, паводле якой і падзялілі Усходнюю Еўропу паміж Сталіным і Гітлерам, не згадваецца ні слова.

Рэзюмэ: «Няма ніводнага сюжэта пра праблемы між народамі» Як падкрэслівае Аляксандр Пашкевіч, важна памятаць: продкі сучасных беларусаў і рускіх цягам цэлых стагоддзяў жылі ў розных дзяржавах. Паміж сабой яны і сябравалі, і варагавалі. Гэтага не могуць ігнараваць нават прапагандысты — але ў дадзеным выпадку няма ніводнага сюжэту пра праблемныя стасункі між народамі.

Але факт і тое, што ў тыя часы пэўная духоўная сувязь земляў былой Русі паміж сабой утрымлівалася праз праваслаўную веру. У ёй была значная частка насельніцтва. Менавіта на гэты аспект стваральнікі «русскомирских» ролікаў найперш і стараюцца ціснуць.

Пашкевіч зазначае: асноўныя факты згадваюцца ў роліках правільна, але маніпуляцыі праяўляюцца большай часткай праз візуальны шэраг і праз адвольныя інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў і нюансаў. А гэта ўжо класічная прапаганда.

І што паглядзець, каб паглядзець на гісторыю з беларусацэнтрычнага погляду?

Абавязкова звярніце ўвагу на падкаст «Так склалася гістарычна». У ім навуковыя дзеячы простай мовай расказваюць пра складаныя гістарычныя падзеі.

На YouTube можна паглядзець ролікі пад хэштэгам #гісторыяза5хвілін. За кароткі час гісторык раскажае пра пэўныя падзеі. У фармаце вялізных лекцый ёсць серыя відэа «Кава з гісторыкам»: гэта YouTube-версіі офлайн-сустрэч, якія арганізуе Беларускі Моладзевы Хаб.

Яшчэ адзін цікавы канал — Слухай сюды. Лекцыя ідзе разам з візуальнымі матэрыяламі, таму глядзець і карысна, і цікава адначасова.

budzma.org

БЕЛАРУСЬ – КІТАЙ

ЗРЯ РАДУЮТСЯ КРАСИВЫМ ФОРМУЛИРОВКАМ ОБ ОТНОШЕНИЯХ С КИТАЕМ

Пропаганда утверждает, что отношения Беларуси и Китая «выходят на новый уровень». Объясняем, почему это не так.

После участия Александра Лукашенко в саммите ШОС, где правителя наконец вынудили надеть маску, приближенный к нему телеграм-канал разразился пафосным сообщением:

— По-прежнему железные братья, но теперь еще круче! Как и договорились на полях саммита ШОС Первый и Си Цзиньпин — двусторонние отношения Беларуси и Китая выходят на новый уровень! МИД КНР сообщает: страны официально установили «всепогодное всеобъемлющее стратегическое партнерство». Что значит эта формулировка!? А то, что дружба между Китаем и Беларусью стабильна и неизменна вне зависимости от того, как меняется международная обстановка.

А первый вице-премьер Николай Снопков сказал: «Принятая в Самарканде декларация — это высший уровень сотрудничества между двумя странами — Китай и Беларусь».

Почему эти заявления не соответствуют реальности?

Во-первых, уже выглядит странным то, что пропагандисты и чиновники видят в подписании декларации с красивыми словами «выход на новый уровень отношений», тогда как на практике совместные проекты, реализуемые в Беларуси, страшно буксуют.

Согласно ресурсу Trading Economics среди импортеров в Китай в 2021 году Беларусь с $1,1 млрд (Белстат оценивает экспорт в Китай в $1,3 млрд, но включает туда Гонконг, Макао и Тайвань) расположилась аж на 83 месте. То есть наша страна значительно уступает по экспорту в КНР таким государствам как Польша, Венгрия, Узбекистан, Казахстан, Украина, Болгария, Словакия и Чехия.

Во-вторых, давайте проверим, действительно ли формулировка «всепогодное сотрудничество» означает на деле высокий уровень сотрудничества. Ранее газета The People's Daily проследила использование китайским властями термина «всепогодный друг»: по крайней мере, на тот момент считалось, что в основе этих отношений лежит признание территориальной целостности Китая, то есть, например, непризнание Тайваня.

Так вот, под статус «всепогодный друг» с 2002-го по 2015 год попал целый ряд стран, включая Сербию, Танзанию и Зимбабве.

Как сказался на отношениях этих стран с Китаем статус с красивой формулировкой? Похоже, в некоторых случаях никак. Так в 2020 году товарооборот между КНР и Зимбабве составил всего $1,4 млрд — в разы меньше, чем товарооборот Китая и Беларуси, которую до недавнего момента «всепогодным другом» не называли.

После 2015 года аналогичным статусом КНР наградила еще несколько стран. Например, Бурунди — слаборазвитое аграрное государство в Восточной Африке, одну из самых бедных стран в мире.

«Всепогодным другом» Китая является также Шри-Ланка.

(працяг на стар. №4)

БЕЛАРУСЬ – КІТАЙ

(пачатак на стар. №3)

Правда, там сильно обиделись на своих партнеров. «Пекин, который в хорошие времена предоставил Шри-Ланке огромные кредиты на инфраструктуру, теперь выделяется своим отсутствием, когда остров находится в кризисе», — пишут СМИ.

В хитрости и даже коварстве Китай подозревают и в других странах. Financial Times писала несколько лет назад:

— Руководители Пакистана описали свои отношения с Китаем как «железные братья» со связями, которые «выше Гималаев, глубже, чем самый глубокий океан и слаще меда». Но эта гиперболическая риторика маскирует тот факт, что Пакистан сейчас фактически является клиентским государством Китая. Многие внутри Пакистана открыто опасаются, что его зависимость от Пекина уже превращает его в колонию своего огромного соседа.

...Отрицательное сальдо для Пакистана в торговле с Китаем за прошлый год — минус около $20 млрд. Отрицательно сальдо Беларуси составляет пока минус $3,2 млрд.

Но вряд ли стоит радоваться красивым словам о новом уровне отношений двух стран. Пока это похоже на старый принцип белорусских властей в отношениях с Россией под названием «нефть в обмен на поцелуи».

Дмитрий Косач
gazetaby.info

МАБІЛІЗАЦЫЯ

ЯРКАЯ ДЕМОНСТРАЦИЯ РУССКОГО ФАТАЛИЗМА

Журналист Виталий Цыганков — о российской мобилизации и фатализме.

— Смотрю на эти ужасные, мрачные кадры российской мобилизации, веселенькое пьяное отправление на убой, — пишет Цыганков в своем ТГ-канале. — Смотрю опросы на улицах, дискуссии в соцсетях.

Впечатляет, насколько это яркая и жестокая демонстрация многократно описанного русского фатализма и пренебрежения к самой жизни. Полное смирение с тем, что всё происходит независимо от твоей воли и желания. «Как Бог даст», «А что я могу», «Мы люди маленькие, за нас всё решили сверху», «Если родина приказала...».

Авось. «Авось пронесет, не убьют». И «великая русская литература», в её школьном варианте, приложила тут свою руку. Начиная от лермонтовского Печорина, почти весь 19 век фаталисты и «лишние люди» были главными героями в русской литературе.

Ну и коллективизм в его традиционной форме «быть как все». Добровольно ж никто не пошёл на войну, — ну а если все идут, то — «на миру и смерть красна». Только вдуматься — «красна». Красива, желанна.

Ну и если по законам жанра в этом месте кто-то спросит «а что у нас?» — так у нас, белорусов, все совершенно по-другому. Никакой загадочной души, никакой широты, которую надо бы «сузить». У белорусов полностью отсутствует мессианское сознание, чувство морального или идейного превосходства над другими людьми и нациями, желание учить их, навязывать им свои ценности.

Наша пресловутая чистота на улицах, хорошие дороги, аккуратные поля, огороды и цветники на дачах — все это направленность «в себя любимого», а не «в мир».

У них — «я хату покинул, пошел воевать, чтоб землю в Гренаде крестьянам отдать». У нас — «купіць зямлю, прыдбаць свой кут».

"Салідарнасць"
gazetaby.info

«ИНОАГЕНТ»

ЛУЧШЕЕ ВЫСТУПЛЕНИЕ АЛЛЫ БОРИСОВНЫ

После новости о признании властями российского артиста Максима Галкина иноагентом его супруга певица Алла Пугачева сама попросила Минюст признать ее иноагентом.

Новость тут же разлетелась по СМИ. «Королева советской поп-музыки осудила путинскую войну в Украине» — с таким заголовком вышла статья в Reuters. И подобные материалы сейчас можно встретить во многих западных изданиях. Некоторые справедливо заметили, что Алла Пугачева переживает момент славы на Западе.

«Салідарнасць» собрала первую реакцию на поступок примадонны российской эстрады.

Александр Фридман, политолог:

— Любопытно: Алла Пугачева попросила признать ее «иноагентом» и осудила войну. Это достойный поступок, которым она перечеркивает себе будущее в путинской России.

Телеграм-канал Город Глуповъ:

— Лучшее выступление Аллы Пугачевой. Браво!

Максим Мирович, блогер:

Ну, пассаж про «наших ребят» я бы опустил, но в целом Алла Борисовна права. И да, она обязательно переживёт нынешнего плешивого диктатора.

Владимир Пастухов, политолог:

— Я редко размещаю не свои материалы у себя на странице, хотя исключения бывают. Но тут трудно удержаться. Есть красивая легенда про датского короля, который надел желтую звезду в знак солидарности с евреями. Но в жизни любого народа бывают такие моменты, когда нужно сказать или сделать что-то такое, чтобы всем стало понятно, кто тут королева, а кто — всего лишь желтая звезда...

Конечно, прокремлевские писаки могут уверять, что известный анекдот про Брежнева — мелкого политического деятеля" времен Аллы Пугачевой, не соответствует действительности. И с годами фигура Брежнева становится только мощнее и крепче (видимо, как коньяк), а Пугачева давно измельчала.

Но злятся они потому, что старый анекдот теперь уж точно можно пересказывать на новый лад, подставив вместо фамилии генсека-«бровеносца в потемках» текущего руководителя России, заплутавшегося и запутавшегося в поисках геополитического величия.

Салідарнасць

ЗНЕШНІ ГАНДАЛЬ

ІМПАРТ, ЯКІ НЕ МЕНШ ВАЖНЫ ЗА ЭКСПАРТ

Ці ўсё добра са знешнім гандлем? Што далей будзе. Знешні гандаль сёння, па сутнасці, выцягвае эканоміку краіны, не дазваляючы ёй канчаткова зваліцца ў бездань. Аднак адначасова ён жа з'яўляецца мінай запаволенага дзеяння. Чаму так — папулярна тлумачыць тэлеграм-канал «Нашы грошы».

Знешні гандаль — гэта тое, што мы купляем і прадаём за мяжу. У ідэале важна вытрымліваць баланс гэтых складнікаў. Яшчэ лепш, калі мы прадаём больш, чым купляем. Менавіта такая сітуацыя цяпер і назіраецца ў Беларусі, на чым прапаганда і акцэнтуе ўвагу.

Нам кажуць: усё выдатна! Сальда знешняга гандлю станоўчае і дасягае рэкордных аб'ёмаў. На самой справе сутнасць таго, што адбываецца, заключаецца ў тым, што ў краіне падае экспарт (за 7 месяцаў гэтага года ён сышоў у мінус на 3,7%), але пры гэтым яшчэ больш падае імпарт (на 8,9%). Вось сальда і расце.

У дзяржаўных СМІ наўрад ці раскажуць, што падзенне імпарту, насамрэч, не меншая праблема для эканомікі. Таксама прапагандысты не захочуць раскласці знешні гандаль па складніках, таму што тады стане зразумела: кароль — голы. А мы раскладзём.

Тавары дзеляцца на «інвестыцыйныя», «прамежкавыя» і «спажывецкія». Паглядзім, што мы маем па выніках 7 месяцаў.



Спажывецкія тавары — усё тое, што купляюць, умоўна, у краме. Іх экспарт прырос на 14%, а імпарт упаў на 9%. У крамах становіцца ўсё менш еўрапейскіх тавараў. «Швейцарскі» шакалад, «італьянскія» макароны і «французскі» сыр, калі прыглядзецца, на самой справе зроблены ў Расіі ці Кітаі.

Што тычыцца экспарту, наша «малочка» і лядоўні сапраўды ня дрэнна прадаюцца на расійскім рынку. Але не трэба цешыць сябе ілюзіямі: адбываецца гэта не з-за павышэння канкурэнтаздольнасці, а якраз наадварот — проста альтэрнатыва стала нашмат меншай.

Прамежкавыя тавары — гэта тое, што трэба вытворцам у выглядзе сыравіны і камплектуючых. У гэтым сектары на 12% упаў экспарт і на 7% — імпарт. У нас усё менш сыравіны і камплектуючых, у выніку некаторыя зборачныя вытворчасці могуць пачаць працаваць з перабоямі або зусім спыніцца. Цяжка сказаць, з чаго зроблены нашы пральныя машыны, тыя ж лядоўні, трактары і тэлевізары. Калі для іх вытворчасці патрэбны толькі кітайскія камплектуючыя (што малаверагодна), можна спадзявацца, што пакуль яны сяк-так, але будуць у наяўнасці. Але калі гэта дэталі з ЕС або ЗША, узнікаюць вялікія праблемы.

Інвестыцыйныя тавары — станкі і абсталяванне. Тут экспарт расце на 17%, але гэта, хутчэй за ўсё, значыць, што некаторыя прылады расіяне цяпер вымушаны купляць у Беларусі. Пры гэтым мы бачым каласальнае падзенне імпарту — на 24%. Адпаведна, беларускія вытворчасці толькі за 7 месяцаў страцілі чвэрць магчымасцей мадэрнізацыі або пашырэння. Успомнім, што наша «малочка», дрэваапрацоўка і іншыя галіны, якія паказвалі рэальныя вынікі, дасягнулі іх за кошт сучаснага абсталявання з Еўропы. Якога больш не будзе.

У аснове беларускага экспарту ляжаць прамежкавыя тавары (каля 57%), яшчэ трэціну займаюць спажывецкія тавары. На долю інвестыцыйных прыпадае каля 13%. У імпарце карціна падобная, толькі доля прамежкавых тавараў вышэйшая — 69%, у той час як долі інвестыцыйных (8%) і спажывецкіх (23%) некалькі ніжэйшыя. Відавочна, што менавіта высокая залежнасць ад імпартнай сыравіны і камплектуючых будзе галоўным галаўным болем беларускай прамысловасці. Складанасці з інвестыцыйным імпартам выявяцца некалькі пазней.

Вобразна можна сказаць, што за дзень сённяшні адказваюць спажывецкія тавары. За тое, што будзе адбывацца праз тыдзень ці месяц — прамежкавыя. А за тое, што здарыцца праз год — інвестыцыйныя.

І калі сёння яшчэ можна «намаляваць» пазітыўную карцінку, то ў сярэднетэрміновай, а тым больш доўгатэрміновай перспектыве ўсё выглядае сумна. Бо калі мы хочам заваліць Расію нашымі таварамі або камплектуючымі, іх элементарна трэба на чымсьці вырабляць.

А магчымасцей падтрымліваць магутнасці, як паказвае падзенне інвестыцыйнага імпарту, будзе ўсё менш.

novychas.online

Заснавальнік і рэдактар: Гаравы Леанід Антонавіч

Адрас рэдакцыі: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: leo592202@gmail.com
Тэл. 8-02139-5-08-52, маб. + 375(29)6723842 (V),
Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

Падпісана да друку 30.09.2022 у 15.15
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.